**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар Інстытута
журналістыкі
_______________ С. В.
Дубовік

_________20.05.13_________
_______
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны№ УД-Р-038/р.

# АСНОВЫ ТВОРЧАГА МАЙСТЭРСТВА ЖУРНАЛІСТА

**Вучэбная праграма для спецыяльнасці:**

1-23 01 08-01 – Журналістыка (друкаваныя СМІ)

Факультэт журналістыкі
Інстытута журналістыкі

Кафедра перыядычнага друку

Курс _2___

Экзамен ___3,4 семестры___

Семестры _3,4___

Лекцыі __36 гадзін

Практычныя (семінарскія)
заняткі __64 гадзін

КСР ___20______
(колькасць гадзін)

Усяго аўдыторных гадзін
па дысцыпліне___120________

Усяго гадзін
па дысцыпліне _244__

Форма атрымання вышэйшай
адукацыі:__дзённая__________10

Склаў(ла) Н.В.Туміловіч, выкладчык

2010 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой вучэбнай праграмы “Асновы творчага майстэрства журналіста”, зацверджанай 10.02.2010, рэгістрацыйны нумар ТД-Е092/тып.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння на пасяджэнні кафедры перыядычнага друку (пратакол № 8 ад 15.04.13)

____________________
(дата, нумар пратакола)

**Загадчык кафедры**
_______________Свораб А.К.

Адобрана і рэкамендавана да зацвярждэнння вучэбна-метадычнай камісіяй Інстытута журналістыкі БДУ (пратакол № 8 ад 24.04.13)

**Старшыня**
____________В. М. Самусевіч

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Асновы творчага майстэрства журналіста” ўведзена для спецыяльнасці 1–23 01 08 “Журналістыка (па напрамках)” (1–23 01 08–01 “Журналістыка (друкаваныя СМІ)”) з мэтай засваення студэнтамі агульных заканамернасцей даследавання жыццёвых сітуацый у палітыцы, эканоміцы, культуры і г.д., падрыхтоўкі іх да самастойнай аналітычнай работы ў газетах і часопісах featureтыпу.

У працэсе стварэння журналісцкага твора кожны аўтар шукае найбольш эфектыўныя шляхі вырашэння творчых задач, якія могуць быць рэалізаваны ў розных жанрах журналістыкі. Пад жанрам журналісцкага твора разумеюць устойлівыя асаблівасці яго змястоўна-тэматычных характарыстык, тыпу адлюстроўваемай рэчаіснасці, кампазіцыі, стылістыкі.

Выбар пэўнай жанравай формы дыктуецца не толькі патрабаваннямі рэдакцыйнага плана і творчымі інтарэсамі журналіста, але і яе асаблівасцямі, прызнакамі. Да іх адносяцца: прызначэнне жанра, аб’ект, прадмет і метады адлюстравання, эмацыянальна-выразныя сродкі, стылістыка і роля аўтара. У сучаснай газетнай публіцыстыцы выкарыстоўваюцца каля двух дзесяткаў жанраў, якія ствараюць своеасаблівы ланцужок, звенні якога даюць магчымасць пераходу ад прасцейшых жанраў да больш складаных.

У журналістыцы гістарычна скларіся тры групы жанраў – інфармацыйныя, аналітычныя, мастацка-публіцыстычныя.

Адрозніваючыся па характару і аб’ёму інфармацыі, форме падачы матэрыялу, публікацыі розных жанраў павінны аб’ектыўна і якасна адлюстроўваць асноўныя працэсы грамадскага развіцця.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.** Важнай мэтай дысцыпліны з’яўляецца прывіццё студэнтам-журналістам цікавасці да навуковай працы, работы з сур’ёзнымі інтэлектуальнымі тэкстамі шырокай жанравай палітры, авалоданне методыкай стварэння журналісцкіх тэкстаў.

У адпаведнасці з вызначанай мэтай асноўныя задачы дысцыпліны наступныя:

1. Даць студэнтам уяўленне аб асноўных творчых метадах у журналістыцы (канстатацыя, публіцыстычны і эсэісцкі метады, метад дзелавой аналітыкі);
2. Навучыць разбірацца ў відах сітуацый (лакальная, аб’ёмная, негатыўная, пазітыўная, стракатая) як асноўных аб’ектаў даследавання і адлюстравання ў журналістыцы;
3. Засвоіць такія паняцці, як тэма і акцэнт аналітычнага твора, вобраз сітуацыі і вобраз твора, канфлікт у аналітычным тэксце, пяць галоўных асаблівасцей творчага працэсу (актуальнасць аб’екта адлюстравання; аператыўны лад дзеяння; безупыннасць інфармацыйнага працэсу; публіцыстычна-эсэісцкая ўніверсальнасць; магчымасць сацыяльнай дыферэнцыяцыі згодна з катэгорыямі інфармацыі), вынік (функцыянальны, дысфункцыянальны, нефункцыянальны, афункцыянальны), кодэкс прынцыпаў работы пры зборы інфармацыі для аналізу сітуацыі.

Студэнт павінен

***ведаць:***

– гісторыю ўзнікнення і функцыянавання, сучасную канцэпцыю жанраў перыядычнага друку;

– ролю прадмета, метадаў узроўню і форм адлюстравання рэчаіснасці ў журналістыцы як яе галоўных жанраўтвараючых фактараў;

– патрэбнасці аўдыторыі ў спажыванні журналісцкай інфармацыі пэўных жанраў;

– тэхналагічныя і метадычныя аспекты дзейнасці ў інфармацыйна-аналітычнай сферы.

***умець:***

– даваць ацэнку жыццёвай рэальнасці з пазіцыі сацыяльнага канструктывізму;

– на ўзроўні практычных навыкаў і ўменняў навучыцца выкарыстоўваць камунікатыўныя, прагматычныя і выразныя магчымасці розных жанраў;

– карыстацца фота і відэаапаратурай, задаваць пытанні і ведаць, куды і за якой інфармацыяй можна звяртацца;

– прымяняць тэарэтычныя веды, атрыманыя ў працэсе вучобы на практыцы.

Узровень засваення зместу дысцыпліны правяраецца, акрамя актыўнасці і сутнасці адказаў на семінарскіх занятках, якасцю тэкстаў, падрыхтаваных студэнтамі (апублікаваных у друку і прынятых да апублікавання).

**Асноўныя метады і тэхналогіі, якія прымяняюцца пры вывучэнні дысцыпліны:**

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэс-канферэнцыя, «мазгавы штурм», вучэбныя дэбаты);

– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць ў ралявых, імітацыйных гульнях;

– метад працы ў малых групах.

**Патрабаванні да арганізацыі кантралюемай самастойнай работы:** выкананне творчых заданняў, падрыхтоўка матэрыялаў для публікацыі ў СМІ.

На вывучэнне дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам спецыяльнасці 1-23 01 08 “Журналістыка (па напрамках)” (1-23 01 08-01 “Журналістыка (друкаваныя СМІ)”) адводзіцца 244 гадзіны, з іх 120 аўдыторных гадзін (36 – лекцыі, 64 – семінары, 20 – практычныя заняткі).

***У трэцім семестры агульная колькасць гадзін складае , з іх аўдыторных – 52 гадзіны (18 – лекцыі, 28 – семінары, 6 – кантралюемая самастойная работа), у чацвёртым семестры агульная колькасць гадзін - , з іх аўдыторных - 68(18 – лекцыі, 36 – семінары, 14 – кантралюемая самастойная работа).***

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

### Тэма 1
### ЖАНРЫ СУЧАСНАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ

Узнікненне журналісцкіх жанраў. Прыкметы, групы, відавыя асаблівасці. Персаніфікацыя і ўніфікацыя тэкстаў. Роля прыёму і апрацоўкі матэрыялаў, эмацыянальна-вобразныя сродкі ўзбагачэння жанравай палітры.

Сістэма журналісцкіх жанраў. Жанраўтвараючыя фактары ў журналісцкім творы. Разгортванне факта ў розных жанрах. Месца фактаў у інфармацыйных і аналітычных жанрах.

Сучасныя тэндэнцыі развіцця жанравай сістэмы. Спецыфіка і функцыі журналісцкага тэкста.

### Тэма 2
### МЕТАД КАНСТАТАЦЫІ

Метад як агульнае паняцце (шляхі даследавання, спосабы дасягнення пэўнай мэты, рашэння канкрэтнай задачы) і творчы метад (спосаб адлюстравання праяў навакольнага свету з living рознымі ўзроўнямі творчай фантазіі).

Сутнасць метаду канстатацыі. Фіксацыя фактаў, падзей, сітуацый, найбольш значнага з убачанага і пачутага. Усе віды канстатацыі засноўваюцца на знакавай фіксацыі (у журналістыцы гэты метад называецца інфармацыйным).

Шматузроўневасць канстатацыі. Прыклад – заметка. Першы ўзровень – хроніка. Другі ўзровень – фіксацыя і падкрэсліванне логікі факта (стандартная заметка). Трэці ўзровень – дэталізацыя. Ступень дэталізацыі залежыць ад значнасці факта і тыпу выдання.

Розніца ў фіксацыі жыццёвага факта (заметка, рэпартаж, замалёўка) і фіксацыі слова (інтэрв’ю, справаздача). Актыўныя і пасіўныя інфармацыйныя формы.

Фіксацыя ў спалучэнні з інтэрпрэтацыяй (“Факт з каментарыем”, іншыя камбінаваныя тэксты).

### Тэма 3
### МЕТАД ПУБЛІЦЫСТЫКІ

Публіцыстычны метад як спосаб распрацоўкі тэмы і адлюстравання сітуацый (лакальных і аб’ёмных; негатыўных, пазітыўных і стракатых).

Аўтарскі маналог у публіцыстычным творы. Візуальны вобраз сітуацыі. Гіпатэтычны вобраз сітуацыі. Комплексны вобраз публіцыстычнага твора.

Тэма і акцэнт публіцыстычнага твора.

Мадэль публіцыстычнага твора: сістэма фактаў, сістэма аргументаў; аналітычны, эмацыянальна акрэслены аўтарскі маналог; аўтарская тэндэнцыйнасць у абагульненнях і вывадах. Імкненне да адназначных вывадаў.

Агульная характарыстыка аналітычных жанраў.

## Тэма 4
## ЭСЭІСЦКІ МЕТАД

Шматпланавасць метаду. Форма свабоднай размовы з чытачом. Адлюстраванне і роздум над складанымі жыццёвымі працэсамі і праявамі. Прыёмы: “раздваенне” аўтара; рэфлексія; лірычная споведзь; параўнанне розных канцэпцый; скарыстанне літаратурных крыніц; філасофскія абагульненні; асацыяцыі (часам парадаксальныя). Экспрэсія і вытанчаны стыль.

Класічнае эсэ (”кабінетная” літаратура) і сучаснае эсэ (набліжэнне да нарысавых формаў). Трансфармацыя эсэісцкага метаду.

Калумністыка як новая з’ява беларускай журналістыкі. Спецыфічныя рысы аўтарскага стылю.

## Тэма 5
## МЕТАД ДЗЕЛАВОЙ АНАЛІТЫКІ

Сістэма жанраў (каментарый, карэспандэнцыя, артыкул, агляд, рэцэнзія) іх структурныя мадэлі, алехарактар аўтарскага маналогу.

Спецыфіка аўдыторыі і выданняў, разлічаных на т. зв. “дзелавых людзей”. Прынцып сацыяльнай дыферэнцыяцыі аналітычных тэкстаў.

Лічбавы матэрыял у творах дзелавой аналітыкі. Забеспячэнне гармоніі аўтарскага маналогу.

## Тэма 6
## ЖУРНАЛІСЦКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ: ПРАГМАТЫЧНЫ АСПЕКТ

Прырода і сутнасць журналісцкай інфармацыі. Прагматычныя ўласцівасці журналісцкай інфармацыі. Мадэліраванне газеты з улікам чытацкіх пажаданняў і прапаноў. Аўтар – газета – чытач: праблемы ўзаемадзеяння. Сенсацыя як спосаб прыцягнення чытацкай аўдыторыі. Крытэрыі адбора журналісцкіх матэрыялаў у русле чытацкіх запытаў.

Навіны і крытэрыі іх адбору. Віды навін. Новыя формы падачы.

## Тэма 7
## РАБОТА З КРЫНІЦАМІ ІНФАРМАЦЫІ З ВЫКАРЫСТАННЕМ РОЗНЫХ МЕТОДЫК

Крыніцы інфармацыі. Агульная характарыстыка. Дакументальныя крыніцы інфармацыі. Інтэрнэт як крыніца інфармацыі. Метады збору інфармацыі. Агульная характарыстыка метадаў журналісцкага пазнання рэчаіснасці. Традыцыйныя і нетрадыцыйныя метады збору інфармацыі. Аналіз і інтэрпрэтацыя атрыманых дадзеных.

## Тэма 8
## ЖУРНАЛІСЦКІ ТВОР: ТЭМА, ЗАМЫСЕЛ, ІДЭЯ, ФАКТ

Нараджэнне журналісцкай тэмы. Замысел твора: узнікненне, накапленне матэрыялу, структура, праблема, гіпотэза. Абдумванне твора: планаванне і канкрэтызацыя рабочай ідэі. Факт як аснова журналісцкага твора. Прырода і прызначэнне факта ў журналісцкім творы. Месца факта ў інфармацыйных жанрах.

Кампазіцыя журналісцкага твора. Загалоўкі і ліды. Прынцыпы пабудовы асноўнага блоку тэкста.

## Тэма 9
## ЗАМЕТКА

Агульная характарыстыка. Асаблівасці і прызначэнне жанра. Тыпы інфармацыйнага зместу заметак. Патрабаванні да заметак. Працэс падрыхтоўкі да напісання заметкі. Жанравыя заметкі: падзейная, анонс, анатацыя, міні-рэцэнзія, бліц-партрэт, міні-агляд, міні-гісторыя, міні-парада. Структура заметкі. Віды заметкі. Літаратурнае афармленне заметкі.

## Тэма 10
## ІНТЭРВ'Ю

Спецыфіка і разнавіднасці жанра. Інтэрв'ю-дыялог: вытокі станаўлення і развіцця. Інтэрв'ю-маналог: асноўныя відавыя прызнакі. Партрэтнае інтэрв'ю: падзейнае, біяграфічнае, юбілейнае, палітычнае. Аналітычнае інтэрв'ю. Інтэрв'ю-паведамленне. Сацыялагічныя віды інтэрв'ю: інтэрв'ю-анкета, інтэрв'ю-дыялог, прэсавае апытанне, пытанне – адказ.

Этапы падрыхтоўкі і правядзення інтэрв'ю. Работа над тэкстам.

## Тэма 11
## РЭПАРТАЖ

Вытокі станаўлення і тэндэнцыі развіцця. Жанравыя межы і творчыя магчымасці. Класіфікацыя сучаснага рэпартажа: агульная характарыстыка. Падзейны рэпартаж. Аналітычны (праблемны) рэпартаж. Пазнавальна-тэматычны рэпартаж. Рэпартаж-расследаванне. Катэгорыі часу і прасторы ў рэпартажы. Аўтар і герой рэпартажа: праблема самавыяўлення. Кампазіцыйна-стылістычныя асаблівасці рэпартажа. Методыка работы над рэпартажам.

## Тэма 12
## СПРАВАЗДАЧА

Агульная характарыстыка і класіфікацыя справаздачы. Разнавіднасці справаздачы: прамая інфармацыйная, агульная, камюніке, тэматычная, праблемная. Методыка работы над справаздачай. Формы падачы справаздач на старонках рэспубліканскай і рэгіянальнай прэсы.

## Тэма 13
## ЗАМАЛЁЎКА

Узнікненне жанра. Віды замалёвак: падзейная, партрэтная, натурная, нарысовая, інтэрв'ю-замалёўка.

Змест і форма замалёўкі. Вобразнае апісанне рэчаіснасці. Аўтар і герой замалёўкі: праблемы самавызначэння.

## Тэма 14
## КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ

Вызначэнне жанра. Спецыфічныя прызнакі. Віды карэспандэнцыі: аператыўная, праблемная. Аналіз тэкстаў. Інфармацыйны, аналітычны, публіцыстычны пачаткі жанра.

Элементы іншых жанраў у карэспандэнцыі (інтэрв'ю, рэпартаж, каментарый). Унутраны і знешні сітуацыйны канфлікт у карэспандэнцыі.

## Тэма 15
## АРТЫКУЛ

Спецыфіка жанра. Віды: праблемны, тэарэтычны, перадавы, палемічны.

Вобраз і выяўленчыя сродкі артыкулаў на тэмы маралі.

Прапагандысцкая скіраванасць жанру (растлумачэнне, распаўсюджанне і зацвярджэнне ідэалаў у розных сферах жыццядзейнасці грамадства).

Работа над артыкулам. Шляхі і метады павышэння дзейснасці крытычнага артыкула. Сістэма фактаў і аргументаў выкарыстання статыстычнага, лічбавага матэрыялу ў пастановачным, крытычным артыкуле.

## Тэма 16
## АГЛЯД

Станаўленне агляду. Віды аглядаў: агульны, тэматычны, міжнародны. Агляд друку, агляд пісьмаў. Публіцыстычны агляд. Безадрасны агляд. Работа над аглядам.

Спецыялізацыя аглядальнікаў па сферах жыццядзейнасці грамадства.

## Тэма 17
## РЭЦЭНЗІЯ

Характарыстыка жанра. Віды рэцэнзій. Публіцыстычная своеасаблівасць жанра.

Відавая літаратурная прыналежнасць літаратурна-мастацкай крытыкі. Творы – аб'ект даследавання, літаратурна-мастацкая крытыка – інструмент даследавання.

Суадносіны літаратурна-мастацкай крытыкі з літаратуразнаўствам і мастацтвазнаўствам.

Дзве структурныя групы рэцэнзіі – інфармацыйна-канстатуючая і даследчая.

Два “адрасы” рэцэнзіі – чытачы і дзеячы літаратуры і мастацтва. Залежнасць “адраса” ад тыпу выдання.

Кніжная рэцэнзія. Кінарэцэнзія і тэатральная рэцэнзія.

Рэцэнзаванне навуковай і грамадска-палітычный літаратуры. Методыка распрацоўкі і правядзення навуковай экспертызы журналісцкага твора. Публіцыстычная скіраванасць твора.

## Тэма 18
## НЕСТАНДАРТНЫЯ ЖАНРЫ СМІ

Прагноз. Версія. Эксперымент. Пісьмо. Гутарка. Анкета. Споведзь. Рэкамендацыя. Парада. Аналітычны прэс-рэліз. Асноўныя патрабаванні да кожнага з гэтых жанраў. Работа журналіста над нестандартнымі жанрамі журналістыкі.

# ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

Выкананне курсавой работы па дысцыпліне “Асновы творчага майстэрства журналіста” ставіць сваёй мэтай паглыбленае засваенне студэнтамі матэрыялу лекцый і аналіз на іх аснове публікацый сучасных СМІ з улікам абранай тэмы, авалоданне навыкамі навуковага даследавання, развіццё аналітычных здольнасцей,уменння працаваць з бібліяграфічнымі крыніцамі інфармацыі.

Прыкладны аб’ём работы складае 20-25 старонак (гарнітура Times New Roman, кегль 14, інтэрвал 1,5), спіс выкарыстанай літаратуры павінен уключаць не менш 15 тэарэтычных крыніц. У адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці колькасць гадзін, адведзеных на выкананне курсавой работы, ***складае ** гадзін.***

## Вучэбна-метадычная карта

| **Нумар раздзела, тэмы, заняткаў** | **Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік пытанняў, якія вывучаюцца** | **Колькасць аўдыторных гадзін** | | | **пячэнне заняткаў (наглядныя, метадычныя** | **Літаратура** | **Формы кантролю ведаў** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Семіарскія аняткі | Кантралюемая самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | Жанры сучаснай журналістыкі | 2 | 4 | 2 | | 3,5,6,7,8,9,10 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 2 | Метад канстатацыі | 2 | 2 | | | 9 | Вуснае апытанне |
| 3 | Метад публіцыстыкі | 2 | 2 | | | 9 | Вуснае апытанне |
| 4 | Эсэісцкі метад | 2 | 2 | | | 9 | Вуснае апытанне |
| 5 | Метад дзелавой аналітыкі | 2 | 2 | | | 9 | Вуснае апытанне |
| 6 | Журналісцкая інфармацыя: прагматычны аспект | 2 | 4 | | | 3,4 | Вуснае апытанне |
| 7 | Работа з крыніцамі інфармацыі з выкарыстаннем розных методык | 2 | 4 | 2 | | 1,4,5,6,8,14 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 8 | Журналісцкі твор: тэма, замысел, ідэя, факт | 2 | 4 | 2 | | 5,6,8,11,12 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 9 | Заметка | 2 | 4 | 2 | | 1,3,4.8 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 10 | Інтэрв’ю | 2 | 4 | 2 | | 2,3,8,15 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 11 | Рэпартаж | 2 | 4 | 2 | | 3,4,10,13,14,16 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 12 | Справаздача | 2 | 2 | | | 3,4,5,7,9 | Вуснае апытанне |
| 13 | Замалёўка | 2 | 2 | | | 3,5,10 | Вуснае апытанне |
| 14 | Карэспандэнцыя | 2 | 4 | 2 | | 3,5,7,9,10 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 15 | Артыкул | 2 | 4 | 2 | | 3,5,7,9,10 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 16 | Агляд | 2 | 4 | 2 | | 3,5,7,9,10 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 17 | Рэцэнзія | 2 | 4 | 2 | | 3,5,7,9,10 | Вуснае апытанне, пісьмовае заданне |
| 18 | Нестандартныя жанры СМІ | 2 | 2 | | | 3,5,7,9,10 | Вуснае апытанне |
| | **Усяго:** | 36 | 64 | 20 | | | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

Кантроль ведаў ажыццяўляецца з дапамогай тэсціравання, мікразалікаў на аснове вусных апытанняў, пісьмовых заданняў, абароны рэфератаў.

### ЛІТАРАТУРА


***Асноўная літаратура:***

1. Васильева Л. А. Делаем новости! М., 2002.
2. Лукина М. Технология интервью. М., 2003.
3. Ким М. Н. Жанры современной журналистики. СПб., 2004.
4. Ким М. Н. Новостная журналистика. СПб., 2005.
5. Мельник Г. С., Тепляшина А. Н. Основы творческой деятельности журналиста. СПб., 2008.
6. Орлова Т. Д. Теория и методика журналистского творчества. Мн., 2005.
7. Основы творческой деятельности журналиста. Ред.-сост. С. Г. Корконосенко. СПб., 2000.
8. Самарцев О. Р. Творческая деятельность журналиста. М., 2007.
9. Стральцоў Б. В. Метад і жанр. Мн., 2002.
10. Тертычный А. А. Жанры периодической печати. М., 2000.
11. Третьяков В. Как стать знаменитым журналистом. М., 2004.
12. Шостак М.И. Журналист и его произведение. М., 1998.
13. Шостак М.И. Работа современного репортера. М., 1996.
14. Шостак М. И. Репортер: профессионализм и этика. М., 2001.
15. Шостак М. И. Интервью: Метод и жанр. М., 1997.
16. Шум Ю. Журналистское расследование. СПб., 2008.

***Дадатковая літаратура:***

1. Аграновский В. Вторая древнейшая. Беседы о журналистике. М., 1999.
2. Бекасов Д.Г. Корреспонденция, статья – жанры публицистики. М., 1972.
3. Белановский С.А. Глубокое интервью. М., 2001.

4. Виленский М.Э. Как написать фельетон. М., 1982.

5. Горохов В.М. Основы журналистского мастерства. М., 1989.

6. Григорян М. Пособие по журналистике. М., 2007.

7. Дапаможнік для журналістаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Мн., 1995.

8. Дзялошинский И.М. Формы и методы работы журналиста с источниками информации. М., 2001.

9. Ильченко С. Н. Интервью в журналистском творчестве. СПб., 2003.

10. Ким М. Н. Журналистика. Методология профессионального творчества. СПб., 2004.

11. Ким М. Н. Технология создания журналистского произведения. СПб., 2002.

12. Кинг Л. Как разговаривать с кем угодно, когда угодно и где угодно. М., 2007.

13. Кодола Н.В. Интервью. Методика обучения. Практические советы. М., 2008.

14. Константинов А. Журналистское расследование: История метода и современная практика. СПб., 2003.

15. Коньков В.И. Речевая структура газетных жанров. СПб., 2004.

16. Копперվуд Р. Как преподносить новости. М., 1998.

17. Красноярова О.В. Структура журналистского текста. Иркутск, 2002.

18. Крикунов Ю.А. Рецензия в газете. М., 1976.

19. Кройчик Л.Е. Современный газетный фельетон. Воронеж, 1975.

20. Лазутина Г. В. Основы творческой деятельности журналиста. М., 2004.

21. Лукина М.М. Современные журналистские технологии в работе с новостями. М., 2001.

22. Мельник Г. Общение в журналистике. СПб., 2008.

23. Мельник Г. С., Ким М. Н. Методы журналистики. СПб., 2006.

24. Мисонжников Б.Я., Юрков А.А. Основы творческой деятельности журналиста. СПб., 2002.

25. Олешко В. Ф. Журналистика как творчество. М., 2003.

26. Отт У. Вопрос + ответ = интервью. М., 1993.

27. Рэндалл Д. Универсальный журналист. М., 1999.

28. Солганик Г. М. Стиль репортажа. М., 1980.

29. Стральцоў Б. В. Асноўныя творчыя метады ў журналістыцы. Мн., 2000.

30. Стрельцов Б. В. Основы публицистики. Жанры. Мн., 1990.

31. Теплюк В.М. Журналист меняет профессию: необычные превращения во имя истины. Владивосток, 1990.

32. Тертычный А.А. Аналитическая журналистика. М., 2010.

33. Тертычный А. А. Расследовательская журналистика. М., 2002.

34. Ткачев П.И. Иду на «вы». Заметки о памфлете. Мн., 1975.

35. Ткачев П.И. Сатиры злой звенящая струна… (о памфлете). Мн., 1980.

36. Фихтелиус Э. Десять заповедей журналистики. 1999.

37. Черникова Е.В. Литературная работа журналиста. М., 2007.

38. Черникова Е.В. Основы творческой деятельности журналиста. М., 2005.

39. Шостак М.И. Информационные жанры. М., 1998.

40. Шумилина ТВ. Методы сбора журналистской информации. М, 1989.

41. Шумилина Т.В. «Не могли бы вы рассказать…»: метод интервью в журналистике. М., 1976.

42. Эрнст О. Слово предоставлено Вам. М., 1988.

## Прыкладныя тэмы курсавых работ

1. Крыніцы інфармацыі ў працы сучаснага журналіста.
2. Лагічнае і эмацыянальнае ў журналісцкай творчасці.
3. Факт і аргументацыя ў публіцыстыцы.

4. Аналіз і сінтэз у журналісцкім тэксце.
5. Дэталь і падрабязнасць у інфармацыйных і аналітычных жанрах.
6. Спецыфіка вобраза ў публіцыстычным творы.
7. Прынцыпы кампазіцыі публіцыстычных тэкстаў.
8. Сенсацыя: жанравыя асаблівасці.
9. Журналісцкі матэрыял як адлюстраванне асобы журналіста.
10. Рэпартаж у сучасным друку.
11. Вобразная і публіцыстычная аснова ў фельетоне.
12. Канфлікт і спосабы яго вырашэння ў газетных публікацыях.
13. Аргументацыя ў літаратурна-крытычным артыкуле.
14. Тып газеты і прыярытэтная праблематыка.
15. Прапаганда здаровага ладу жыцця ў друку.
16. Нарыс і замалёўка ў раённай газеце.
17. Эвалюцыя інфармацыйных жанраў.
18. Журналіст бярэ інтэрв'ю: сучасныя аспекты жанру і метаду.
19. Газетная справаздача: мэты, жанравыя асаблівасці.
20. Сучасная жанравая структура фотажурналістыкі.
21. Карэспандэнцыя ў перыядычным друку: прыярытэтная праблематыка.
22. Артыкул на тэмы маралі.
23. Праблемны артыкул у друку.
24. Публіцыстычны агляд друку.
25. Праблемы выхавання на старонках газет.
26. Рэклама ў кампазіцыйна-графічнай мадэлі газеты.
27. Камерцыйная прэса на інфармацыйным рынку.
28. Фатаграфія ў стварэнні іміджу перыядычнага выдання.
29. Воблік масавага выдання: праблематыка, жанры, дызайн.
30. Пісьменніцкая публіцыстыка ў перыядычных выданнях.

**Прыкладныя пытанні да экзаменаў**

1. Узнікненне газетных жанраў.
2. Работа над карэспандэнцыяй. Аналіз газетнага тэкста.
3. Аналітычныя жанры СМІ. Асноўныя прыкметы і групы.
4. Артыкул на тэмы маралі.
5. Узаемадзеянне артыкула з іншымі жанрамі.
6. Карэспандэнцыя: азначэнне, спецыфічныя жанравыя прызнакі,
7. Лічбавы матэрыял у творах дзелавой аналітыкі.
8. Сучасныя тэндэнцыі развіцця журналісцкіх жанраў у СМІ Беларусі.
9. Тэатральная рэцэнзія.
10. Тыпы і віды карэспандэнцыі. Замысел, факт, тэма.
11. Публіцыстычны змест рэцэнзіі.
12. Выкарыстанне мастацка-вобразных сродкаў у карэспандэнцыі: метафар, эпітэтаў, рытарычных пытанняў, прыказак, прымавак, параўнанняў.
13. Міжнародны агляд.
14. Праблемная карэспандэнцыя.

15. Выбар літаратуры для крытыкі і бібліяграфіі.
16. Артыкул: спецыфіка і віды жанра.
17. Рэцэнзаванне твораў мастацкай літаратуры.
18. Дыскусійная прырода аналітычных тэкстаў і дыскусіі ў газеце.
19. Работа з афіцыйнымі дакументамі.
20. Гісторыя станаўлення агляду.
21. Галоўная функцыя публіцыстыкі. Эфектыўнасць і дзейснасць: шляхі іх павышэння.
22. Крытыка-бібліяграфічная работа ў газеце.
23. Методыка работы аглядальніка.
24. Методыка работы над справаздачай.
25. Перадавы артыкул: методыка напісання.
26. Кінарэцэнзія: методыка работы над матэрыялам.
27. Камбінаваныя інфармацыйна-аналітычныя жанравыя формы.
28. Вобраз выдання і вобраз твора.
29. Вядучыя публіцысты-аналітыкі Беларусі.
30. Аналітычнае апісанне як жанр. Работа над апытаннем.
31. Інтэрв'ю-метад і інтэрв'ю-жанр: грані журналісцкага майстэрства.
32. Палемічны артыкул.
33. Творчая майстэрня рэгіянальнага журналіста.
34. Агляд пісьмаў у газеце.
35. Месца публіцыстыкі сярод іншых родаў літаратуры.
36. Крытычны сігнал (заметка).
37. Журналісцкая справаздача масавага мерапрыемства.
38. Метад. Творчы метад. Адметнасць творчага метаду ў журналістыцы.
39. Асаблівасці рэагавання на крытычнае выступленне газеты.
40. Эсэісцкі метад – метад развагі.
41. Выкарыстанне нестандартных жанраў у СМІ. Сацыялагічнае рэзюме. Маніторынг. Анкета.
42. Праблемная карэспандэнцыя.
43. Справаздача на старонках газеты. Віды і жанравыя асаблівасці.
44. Сацыяльная дыферэнцыяцыя публіцыстычных і інфармацыйных тэкстаў.
45. Работа над аглядам друку.
46. Метад канстатацыі. Фіксацыя факта і слова.
47. Агульны і тэматычны агляды. Методыка работы над імі.
48. Адметнасць публіцыстычнага і эсэісцкага аўтарскага маналогу.
49. Газетны агляд.
50. Выкарыстанне нестандартных жанраў у СМІ: рэйтынг, прагноз, версія, эксперымент.
51. Пісьмо як форма зносін. Асноўныя прызнакі і групы. Работа над пісьмом.
52. Рэцэнзія: характарыстыка жанра, віды рэцэнзій.